УДК 81’42 : 811.161.3

# ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ЎНУТРАНАГА СВЕТУ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ


***В. Ю. Шыманская***
*Загадчык кафедры замежных моў*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*
*shymans@bspu.by*



На сучасным этапе развіцця мовазнаўства ў фокусе ўвагі айчынных лінгвістычных даследаванняў знаходзіцца моўная мадэль свету беларусаў і сутнасныя змены, якія адбываюцца ў ей у выніку інтэрферэнцыі традыцыйных і інавацыйных працэсаў як лінгвістычнага, так і экстралінгвістычнага характару. У артыкуле прадстаўлены агляд асноўных палажэнняў лінгвакультуралагічнага, лінгвакагнітыўнага і псіхалінгвістычнага падыходаў да інтэрпрэтацыі з’яў унутранага свету чалавека. Абгрунтавана неабходнасць аналізу зрухаў у рэпрэзентацыі ўнутранага свету чалавека ў беларускай мове праз супастаўленне звычаевай і навуковай карціны свету з выкарыстаннем метадалогіі дыскурс-аналізу.



***Ключавыя словы:*** унутраны свет чалавека; дыскурс-аналіз; навуковая мадэль свету; моўная мадэль свету беларусаў; інтэрферэнцыя дыскурсаў.


# ПОДХОДЫ К ИЗУЧЕНИЮ РЕПРЕЗЕНТАЦИИ ВНУТРЕННЕГО МИРА ЧЕЛОВЕКА В БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ


***О. Ю. Шиманская***
*Заведующий кафедрой иностранных языков*
*Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка, г. Минск*
*shymans@bspu.by*



На современном этапе развития языкознания в центре внимания отечественных лингвистических исследований – языковая модель мира белорусов и существенные изменения, происходящие в ней в результате интерференции традиционных и инновационных процессов как лингвистического, так и экстралингвистического характера. В статье представлен обзор основных положений лингвокультурологического, лингвокогнитивного и психолингвистического подходов к интерпретации явлений внутреннего мира человека. Обоснована необходимость анализа изменений в репрезентации внутреннего мира человека в белорусском языке путем сопоставления наивной и научной картины мира с использованием методологии дискурс-анализа.



***Ключевые слова:*** внутренний мир человека; дискурс-анализ; научная модель мира; языковая картина мира белорусов; интерференция дискурсов.


# APPROACHES TO THE STUDY OF INNER WORLD REPRESENTATION IN THE BELARUSIAN LANGUAGE


***O. Y. Shymanskaya***
*Head of the Department of Foreign Languages*
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk*
*shymans@bspu.by*



At the current stage, the focus of domestic linguistic research is on the Belarusian natural language ontology and the essential transformations occurring in it as a result of the interference of traditional and innovative processes of both linguistic and extralinguistic nature. The article presents an overview of the main provisions of the linguistic-cultural, linguistic-cognitive and psycholinguistic approaches to the interpretation of the phenomena of the human inner world. The author substantiates the need to analyze the shifts in the representation of the human inner world in the Belarusian language by comparing the natural and scientific language ontology using the methodology of discourse analysis.



***Keywords:*** human inner world; discourse analysis; scientific model of the world; natural language ontology; interference of discourses.

На сучасным этапе развіцця мовазнаўства ў фокусе ўвагі айчынных лінгвістычных даследаванняў знаходзіцца моўная мадэль свету беларусаў і сутнасныя змены, якія адбываюцца ў ей у выніку інтэрферэнцыі традыцыйных і інавацыйных працэсаў як лінгвістычнага, так і экстралінгвістычнага характару. Заканамернасці рэпрэзентацыі ўнутранага свету чалавека ў беларускай мове вывучаюць розныя даследчыкі.

Так, навукова-педагагічная школа прафесара В. А. Маславай прадстаўляе лінгвакультуралагічны падыход да інтэрпрэтацыі моўных з'яў, прадстаўнікі якога лічаць, што такі ен спрыяе спасціжэнню сацыяльна-гістарычнай і этнакультурнай адметнасці народа. Даследуючы нацыянальна-культурную спецыфіку беларускага мастацкага тэксту і моўныя адзінкі, якія рэпрэзентуюць лінгвакраіназнаўчую інфармацыю, А. С. Дзядова слушна сцвярждае, што яны адлюстроўваюць “унікальнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры, традыцыйныя маральныя каштоўнасці, этнічны характар, мудрасць і таленавітасць беларусаў як самастойнай нацыі” [1].

У межах навукова-педагагічнай школы прафесара В. Д. Старычонка рыхтуюцца даследаванні метафарычнай рэпрэзентацыі ўнутранага свету чалавека ў мове і ў мастацкім тэксце, асноўным метадам якіх выступае семантычны аналіз, кампанентны аналіз, выкарыстоўваецца інструментарый кагнітыўнай лінгвістыкі.

Як сцвярджаюць К. І. Субота і М. Ю. Чыкіль, адным з актуальных на сення падыходаў да інтэрпрэтацыі ўнутранага свету чалавека з'яўляецца літаратуразнаўчы. Услед за расійскімі даследчыкамі, навукоўцы вызначаюць унутраны свет чалавека як “ментальную мадэль свету псіхалагічнага, інтэлектуальнага, духоўнага і мастацкага (паэтычнага) характару, сфарміраваную ў працэсе анталагічнага і мастацкага (паэтычнага) пазнання” [2].

Унутраны свет чалавека фармуецца пад уздзеяннем разнастайных фактараў – знешніх і ўнутраных, ен “рэгулюе адносіны суб'екта з навакольным светам і самім сабой, адбіваецца на самаадносінах і самапазнанні” [2]. Лагічна, што ў працэсе экстэрыярызацыі матываў, імкненняў, каштоўнасных арыентыраў і суджэнняў пра рэчаіснасць адбываецца моўнае адлюстраванне і фармулеўка думак, адносінаў, інтэнцый.

У гэтым сэнсе неабходна прыгадаць яшчэ адзін падыход да інтэрпрэтацыі адлюстравання з'яў унутрана свету чалавека ў мове – псіхалінгвістычны. А. І. Улановіч указвае на сувязь мовапараджэння з дзейнасным характарам маўлення, гэта значыць, што фармуляванне выказвання, падбор лексічных і граматычных сродкаў, выбар інтэнцыі ажыццяўляецца чалавекам (як свядома так і падсвядома) пад уплывам даступных сродкаў эксплікацыі думкі, а таксама пад уплывам матываў, каштоўнасцей і мэты адрасата. Менавіта выказванне дапамагае нам зрабіць высновы пра “меркаванні чалавека пра рэчаіснасць, адносіны, пачуцці” [4].

Як бачым, комплекснае даследаванне рэпрэзентацыі ўнутранага свету чалавека ў беларускай мове можа ажыццяўляцца з апорай на інструментарый розных галін мовазнаўства і іншых гуманітарных навук. На наш погляд, найбольш запатрабаваным на сучасным этапе з'яўляецца вывучэнне канцэптуалізацыі ўнутранага свету чалавека ў катэгорыях наіўнай і навуковай мадэлі свету з выкарыстаннем метадалогіі дыскурс-аналізу.

У наіўнай карціне свету чалавек уяўляе сабой сукупнасць цела і душы, знешняга чалавека і ўнутранага, якія, у сваю чаргу, успрымаюцца праз прызму культуры і мовы. Калі разглядаць унутраны свет чалавека не толькі як суб'ектыўную катэгорыю асобы, але экстрапаляваць яе на ўсіх носьбітаў мовы і прадстаўнікоў нацыі, можна выявіць пэўныя ўніверсальныя рысы, уласцівыя моўнай мадэлі свету. У моўнай мадэлі свету беларусаў эмоцыі як непадуладныя кантролю супрацьпастаўляюцца пачуццям і думкам. Наяўнасць і знешняе праяўленне эмоцый не ўхваляецца, лічыцца, што эмоцыі трэба кантраляваць і хаваць, пацвярджэнне чаму знаходзім у парэміялогіі, фразеалогіі, моўных метафарычных мадэлях: *патаемныя пачуцці, сцішыць лавіну эмоцый, не давай волю эмоцыям (“Звязда”).*

У навуковай карціне свету, у сваю чаргу, афекты супрацьпастаўляюцца эмоцыям і пачуццям на падставе працягласці і ўсвядомленасці (кантролю). Усвядомленая эмоцыя эвалюцыянуе ў катэгорыю пачуццяў, наяўнасць і праяўленне якіх ужо не з'яўляецца непажаданым, што адлюстроўваецца ў публіцыстычных тэкстах, дзе пераважаюць спалучэнні, у якіх праяўленне пачуццяў характарызуецца станоўчай канатацыяй: *Важна не блытаць дэпрэсіўны стан і дэпрэсію. Дэпрэсія – гэта хвароба, якую варта лячыць ("Звязда").*

Распрацоўка тэмы дазволіла выявіць зрух ад метафізікі наіўнай, міфалагічнай мадэлі свету да навуковай катэгарызацыі рэчаіснасці. Гэты зрух натхнены ростам дасведчанасці шырокай грамадскасці аб псіхалогіі, псіхічным здароўі і эфектыўных стратэгіях зносін. Трансфармацыю моўнай мадэлі свету ў бок навуковага прадстаўлення і інтэрпрэтацыі падзей можна ўбачыць праз укараненне псіхалагічнай тэрміналогіі ў агульную мову, а таксама праз кантэкстуальнае выкарыстанне паняццяў эмоцый і метафар, у якіх яны прадстаўлены без негатыўнай канатацыі як свядомыя дзеянні, за якія суб'екты нясуць адказнасць. Гэта бачанне рэзка адрозніваецца ад папярэдняй канцэпцыі "стыхійных" эмоцый, непадуладных кантролю, крышталізаванай у беларускай фразеалогіі і парэміялогіі.

Паводле К. І. Суботы, публіцыстычная тэксты адлюстроўваюць і фарміруюць эмацыйны інтэлект, "сацыяльны менталітэт, каштоўнасна-сэнсавыя арыентацыі грамадства, … мадэлююць унутраны свет чалавека" [3]. Разглядаючы публіцыстычны дыскурс як люстэрка моўнай мадэлі свету з пазіцый лінгваканцэпталогіі, можна заўважыць, што адбываецца паступовы пераход ад інфармавання і эмацыйнага ўздзеяння на чытача да фарміравання карціны свету сродкамі масавай інфармацыі. Асабліва актуальным гэтае палажэнне з'яўляецца ў святле Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2021 – 2025 гады, якая прадугледжвае павышэнне псіхалагічнай культуры падлеткаў і моладзі, фарміраванне іх светапогляду і каштоўнасных арыентыраў.

Неабходна адзначыць, што менавіта публіцыстычныя тэксты забяспечваюць спрыяльнае асяроддзе для засваення агульнай мовай спецыяльнай псіхалагічнай тэрміналогіі і паступовага ўключэння яе ў узус мовы. Невыпадкова ў медыйных тэкстах даволі часта сустракаюцца апісанні з'яў унутранага свету чалавека, якія спалучаюць звычаевыя і навуковыя найменні: *У псіхалогіі ёсць такое паняцце, як сепарацыя. Яно азначае адасобленасць паміж бацькамі і дзіцем. Дыхальная гімнастыка па сістэме цігун мне вельмі дапамагае ("Звязда").*

Гэтыя прыклады сведчаць пра тое, што на пачатковым этапе засваення мовай тэрміналогіі неабходныя тлумачэнні, свайго роду "перакладчыцкі каментар" са спецыяльнай мовы на агульнаўжывальную. Аднак статыстычны аналіз публіцыстычных тэкстаў сведчыць пра паступовае знікненне такіх тлумачэнняў з кантэксту, а псіхалагічная тэрміналогія становіцца зразумелай усім носьбітам мовы.

Такім чынам, на аснове сістэмнага аналізу айчыннай і замежнай літаратуры, сістэматызацыі статыстычнай (карпусы тэкстаў, выбарка з тэкстаў), лексікаграфічнай інфармацыі і дыскурс-аналізу ў выніку даследавання значна паглыблена тэорыя рэпрэзентацыі з'яў унутранага чалавека ў беларускай мове, вызначана камунікатыўна-прагматычная спецыфіка функцыянавання моўных і індывідуальна-аўтарскіх намінацый феноменаў унутранага свету чалавека ў публіцыстычным, эканамічным, мытным, палітычным і мастацкім дыскурсе.

Навуковая навізна даследавання заключаецца ў выяўленні заканамернасцей трансфармацыі ментальна-моўнай прасторы Беларусі праз інтэрферэнцыю дыскурсаў і імплементацыю псіхалагічных ведаў у медыйныя тэксты, у абгрунтаванні пашырэння сферы ўжывання навуковай псіхалагічнай лексікі з адначасовым захаваннем сувязі вобразаў унутранага свету чалавека з традыцыйнай мадэллю свету беларусаў,

маніфестацыі сучаснага пераасэнсавання традыцыйных вобразаў у катэгорыях навуковага пазнання.

Праведзенае даследаванне выразна ўпісваецца ў асноўныя напрамкі сучаснай лінгвістычнай навукі, робіць унесак у сістэматызацыю найменняў з'яў унутранага чалавека, выяўляе практычныя і прыкладныя аспекты імплементацыі навуковых ведаў у адукацыйны працэс, у працэс выхавання і псіхалагічнай асветы моладзі, што будзе садзейнічаць забеспячэнню ўстойлівага развіцця беларускага грамадства, павышэнню якасці выхаваўчай работы, умацаванню стабільнасці і бяспекі Беларускай дзяржавы.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ ДР 20211211).*

*Бібліяграфічны спіс:*

1. Дзядова, А. С. Беларускі мастацкі тэкст як носьбіт лінгвакраіназнаўчай інфармацыі і выразнік нацыянальнага менталітэту / А. С. Дзядова, В. А. Кукушкіна [Электронны рэсурс] // Чтения имени А. С. Дембовецкого. 755-летию Могилева посвящается: сб. ст. I Междунар. науч.-практ. конф.: в 2 ч. / М-во образования Респ. Беларусь, М-во науки и высш. образования Рос.Федерации, Белорус.-Рос. ун-т; редкол.: М. Е. Лустенков (гл. ред.) [и др.]. – Могилев: Белорус.-Рос. ун-т, 2022. – Рэжым доступу: http://e.biblio.bru.by/handle/1212121212/23118 – Дата доступу: 10.02.2024.
2. Субота, К. І. Вербалізацыя адмоўных інтэнсіўных эмоцый унутранага свету чалавека у публіцыстычным дыскурсе / К. І. Субота, М. Ю. Чыкіль // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка, псіхалогія, філалогія. – 2023. – № 2 (116). – С. 93–97.
3. Субота, К. І. Унутраны свет чалавека праз прызму псіхалагічных і лінгвістычных даследаванняў / К. І. Субота, М. Ю. Чыкіль // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2021. – № 4. – С. 74–77.
4. Уланович, О. И. Психолингвистика: Учеб. пособие / О.И. Уланович. – Минск: Изд-во Гревцова, 2010. – 240 с.